Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень

Адрэс рэдакції і адміністрації: Вільня, Віленская вул., № 29

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г. 2 р 50 к, на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес —25 к. За граніцэй: на 1 г.— 4 р. на 6 мес —2 р. 3 мес.—1 р. Перемена адрэсу—20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам з фаміліей, хто не захочэ, каб была надрукавана праўдзівая фамілія Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакції. Рукапісы аўторам не вертаюцца назад

Год IX. 20 Марца 1914 г. № 11—12

**За мінуушы тыдзень нумэр не выйшоу с прычыны друкарскай забастоукі.**

## Пуцяводная ідэя.

Калі першы раз з грудзей беларуса-мужыка вырваўся кліч: «жыве Беларусь!», — ў ім зліліся ў вадно і пачуцьцё свайго нацыянальнаго я, і прабудзіўшаяся сьведамасць, што ён—чэлавек, роўны ўсім іншым, і захованае ў таёмнай глыбіне душы жаданьне волі і зямлі.

Ўсе думкі яго былі аб вызваленьні з нядолі, пагарды людзкой, с цемнаты. Вызваліўшаяся з адвечных путоў *душа* беларуса жадала скінуць путы і с *цела*.

Так нарадзіліся поруч і поруч ішлі два гэтые жаданьня: ў беднасьці, ў голадзі, холадзі і непамернай працы штодзеннай німа мейсца для вольнай думкі, для свабоднай і радаснай творчэскай працы, што *будуе* новае жыцьцё. Беларус нейкім інстынктам зразумеў гэта, і ў програмах нашаго національнаго адраджэньня національнае вызваленьне беларусоў лучылося з самых першых дзён з вызваленьнем экономічно соціальным. Вось чаму беларускі рух зразу жэ стаўся рухам *дэмократычным*: ён абыймаў *усё жыцьцё* працоўнаго беларускаго народу — ва ўсіх яго праявах.

Калі грамада работнікоў ідзе да працы — будаваць дом, дык кожнаму выдзеляецца нейкая частка агульнай работы паводлуг яго здольнасьці і знаўства. Гэтак адны стаўляюць сцены, другіе — столь, трэйціе — печы, а іншые— дзьверы, вокны ды падлогі робяць. Але ўсе яны ведаюць, што і да чаго робіцца, ведаюць, што, працуючы па-асобку—кожны на сваім мейсцы яны ідуць *да аднэй мэты:* стаўляюць дом. Кожын з іх разумее цэну сваей работы — і ніводзін, робячы сваё дзела, не забываецца, што гэта адно толькі невялікая частка гмаху.

Гэтак ад самаго пачатку беларускаго руху глядзелі на сваю працу і першые сяўцы беларускай ідэі—першые работнікі на роднай ніве Ці хто працаваў над прасьветай, ці шырыў палітычную або національную сьведомасць, ці выдаваў кніжкі і газэты, або вершы пісаў, ці, ўрэшці, вучыў братоў сваіх, як лепей гаспадарыць, як хаўруснай працай змагацца з усе лякімі штодзеннымі злыбедамі — ўсе яны ведалі, што працуюць дзеля аднэй справы, роўна для ўсіх дарагой і вялікай: для справы ўсестароннаго адраджэньня свайго народу.

Аднак з развіцьцем руху—між працоўнікамі на глебі народнай пачалі аб'яўляцца людзі, для каторых національная справа не лучылася болей са справай дэмократызму. Сьляпые: яны бачаць толькі адзін бок жыцьця народу, іх слабые вочы за *апраткай душы* народнай — мовай — ня могуць дагледзіць *самай душы*. Яны, ганяючыся за чыста національнымі ідэаламі, не бачуць сьлёз і гора працоўнаго народу, ня чуюць таго крыку, што рвецца з набалелых грудзей гаротніка: „хлеба!..“

Гэтак ад шырокаго дэмократычнаго беларускаго руху адзеляюцца маленькіе ручайкі, каторые ўжо *не захопліваюць усяго жыцьця* нашаго працоўнаго народу, займаюцца адным бокам жыцьця, думаючы, бытцым апрача іх німа нічога. Змаганьне за хлеб, за грамадзянскіе правы і волю адыходзіць у іх нейдзе ў цень. Працуючы на грунці літэратуры, прыгожаго штукарства, або іншым, яны не аглядаюцца на тых хто побач працуе на іншым грунці, не еднаюцца з імі сваімі думкамі і ідэаламі.

Праўда, праца асобных людзей дзеля тэй ці іншай справы можэ быць карыснай. Але каб гэта праца дала найболей карысьці, ўсіх іх павінна лучыць у вадно адна супольная думка, адно жаданьне: жаданьне *усестаронняго* адраджэньня беларускаго народу. Іначэй многа шчырых думак змарнуецца, многа сіл, раскінутых па нашай зямлі, будзе гібець без карысьці, і грамада сыноў Мэткі-Беларусі, пабітая на гурткі, кружкі і кружочкі, ня здолее стварыць тэй вялікай сілы, што можэ збудаваць *новае жыцьцё*.

Вось чаму ўсе шчырые беларусы дэмократы павінны паказваць справядлівую дарогу тым, хто не дагледзіў усяго абшару працы ўсенароднай,—павінны еднаць усе сілы беларускіе на грунці шчыраго дэмократызму і вясьці сьведомых сыноў народу Беларускаго да ясных зор волі, роўнасьці і брацтва, што роўна сьвецяць усім націям ва ўсіх канцох сьвету.—Толькі тады праца асобных людзей ня будзе гінуць дарма, і кожная цэгліна, паложэная на сваё мейсцо, будзе падыймаць усё вышэй і вышэй гмах народнаго жыцьця.

а - н - а.

## 350 летняя гадаушчына друку у Маскоушчыне.

Роўна 350 гадоў таму назад, 1 марца 1564 году, была выпушчэна з друкарні, першая у Маскоўшчыне друкаваная кніжка «Апостол».

Маскоўшчына была тады вельмі атсталай старонкай і сьвятлейшые маскоўскіе людзі бачылі гэта і стараліся што маглі рабіць каб шырыць асьвету. Найболей працаваў над асьветай мітропаліт Макарый. Але цяжка было шырыць асьвету бяз кніг, бо у Маскоўшчыне тады ня ўмелі ешчэ друкаваць кніг і усе кнігі перэпісываліся рукой, дзеля гэтаго кнігі былі дарагі дужа і іх было мала, бо не было граматных людзей. Вось мітрополіт Макарый і пачаў угаварываць цара Івана Грознаго заложыць у Маскве друкарню. Ён казаў: кнігі (духоўные) маюць многа абмылак і іх трэба паправіць і трэба, хочучы каб народ прасьвечаўся, даць яму кнігі у роднай мове. Цар ахвотна прыстаў на гэта і выпісаў з Голяндіі немца друкара Але той заместа заняцца сваім дзелам пачаў займацца нагаварываньнем маскоўцоў, а нават і самаго Цара на лютэранство. Само сабой, што маскоўцы пратурылі таго немца ды ізноў асталіся з аднэй добрай думкай мець друкаваные кніжкі. Але як іх мець, калі ніхто у Маскоўшчыне ня ведаў друкарскаго сэкрэту. Тут сталі у прыгодзе два прыяцелі Іван Фёдоров і Пётр каторага празывалі Мсціслаўцам: яны вызваліся сарганізаваць друкарню і наладзіць друкаваньне кніжэк. Маскоўцы ахвотна прысталі і пачалі будаваць друкарскі дом (Печатный дворъ).

Прозвішчэ аднаго с прыяцелёў друкароў было «Мсціславец», каторае паказывае што ён родам Беларус могілеўск. губ. Але скульжэ Беларусь магла даць умелаго друкара, калі ня мела яго маскоўшчына? Увесь сэкрэт у тым, што Беларусь тады не была цёмнай старонкай. Друкарство у Беларусь зашло у канцы XV сталецьця. Фіоль у 1491—1493 гаду друкаваў кнігі для Беларусі і Украйны у Кракаве, а праз 23 гады полацкі жыхар Францішак Скарына друкаваў ужо «дзеля лепшаго вы разуменьня» Біблію па беларуску у Празе (1517 г.), пасьля у Вільні (1525) і каля 1563 году у Беларусі друкарская умеласць была ужо рэччу саўсім звычайнай. Таму то Мсціславец, апынуўшыся у Маскве мог вызвацца абарудаваць друкарню, бо у сябе дома, на Беларусі, азнаёміўся з гэтым дзелам.

Але народ у Маскоўшчыне быў лішне цёмны ешчэ і дзеля гэтаго не пасьпелі выпусьціць у сьвет першую кніжку, як падняўся бунт проці «чортавай выдумкі». Узбунтаваны народ напаў на друкарскі дом, пабіў і папсаваў машыны, а друкары уцяклі на Беларусь, ратуючы сваё жыцьцё. Прытулак першые маскоўскіе друкары знайшлі у Заблудове, (Гродз губ.) у гэтмана Ходкевіча і тут залажылі «Учительное Евангеліе» 1569 на пекнай беларускай мове. Пасьля Мсціславец пераехаў са сваей друкарняй у Вільню, А Фёдоров знайшоў прыпынак на Украйне у гор. Астрозе у князе Канстантына Острозкаго, дзе надрукаваў слаўную „Острозжскую Біблію».

Гэтак закончылася першая спроба даць друкаванае слова Маскоўшчыне. Нанова пачалі друк кніг у маскоўшчыне толькі за Цара Фёдара Алексеевіча. Цяпер вёў асьветную працу у Маскоўшчыне ужо другі беларус Сімеон Полацкі. Сімеон Полацкі вядомы у гісторыі маскоўскай асьветы чэлавек. Ён узгадовываў Царскіх дзяцей, быў прыдворным паэтам, радай і вучоным і ён падняў нанова думку, каб устроіць друкарню і маючы вялікае значэньне пры дварэ яму гэта лёгка удалося зрабіць. Друкарскі дом быў нанова адбудаваны Цяпер першай кнігай надрукаванай у маскоўшчыне быў «Тестамент Васія цара Грэчэскаго». А пасьля „Псалтыр“ перэкладзеная Сімеоным Полацкім на вершы.

У 1705 гаду Пётр I завёў гражданскі шрыфт. Ня ведаем ці памагаў яму які беларус, але першая кніга гражданкай надрукованая называецца: „Прыклады, как пішутся комплімэнты“.

Цяпер адна Масква што год друкуе кніг на 15 мільёноў рублёў, а ва ўсей Расеі расейскіх кніг друкуецца у год болей як на 80 мільёноў руб.

А у Беларусі?

Власт.

## Што мы чытаем?

Дзевяць гадоў таму назад нашы вёскі і сёлы дужа любілі пачытаць карысную кніжку. Тады добрая дзяшовая кніжка пападала у хату і варушыла „стары сьвет“- а цяпер ня толькі старые, а і моладзь гуляе у карты. Гэта не таму, што нету ахвоты да кнігі а проста недзе узяць кніг. Пры нашых вясковых земскіх школках нету бібліотэк, а у селян німа грошы купляць кнігі і навука скора забываецца. Вёска рада усякай кнізе, а найболей селяне цікавяцца кнігамі аб зямельнай справе ды іх нету. Нету духоўнай стравы нашаму селяніну, яму астаюцца толькі казкі, басьні Я аб'ездзіў многа вёсак у полацкім павеці і нідзе не знайшоў добрай, а ўсё не карысные кніжкі у селян, аб каторых самі чытачы кажуць: «гэта ня кніжка, а адзін тлум».

Часта сустрэчаў я беларускіе кніжкі, ды не ў селянскай хаці, а у воласьці, ці ў школі, чытаюць толькі „інтэлігенты“, а простаму народу яны не даступны праз дарагавізну. Адзін «Беларускі Календар пападаецца селяніну, бо гэта карысная для вёскі кніжка найдзешавейшая разам. Падходзіць гаспадар да крамніка кніганошы купіць дзецям кніжку і відзіць: лежаць побоч «Wieczarnicy» Дуніна Марцінкевіча і «Бова Королевичъ»; у аднэй 32 стр і цэна залатоўка, а у другой 97 стр. і атдаюць за дзесятку (5 кап.) і селянін бярэ сабе «Бову Королевича». У нас беларусоў німа дзяшовых народных кніжэк а гэта вялікі недахват. Эх, горэ ды бедната! Каб мы былі багаты, то і кніжку можна было-бы надрукаваць дзешавей.

І ешчэ адзін недахват, што беларускіе песьняры,—Дунін Марцінкевіч, Богушэвіч, — надрукаваны толькі лацінскімі літэрамі, а нашы, вітэбскіе селяне, чуць, трапляюць чытаць рускімі літэрамі, а латыні і ў вочы ня відзелі. А Богушэвіч у сваіх вершах, мейсцамі, так праўдзіва выліў думкі нашаго селяніна, што проста грэх не даць яго нашай вёсцы. Радасна ужо тое, што хоць наш «Беларускі Календар» даступен селяніну і ляжыць што год у 20,000 селянскіх хатах на палічцы пад бажніцай. Але гэтым здаволіцца мы не павінны: нам патрэбна свая дзяшовая народная літэратура.

Д. Шчырый.

ку з гэтым, пачалася забастоўка у Варшаўскім унівэрсытэці.

= Петрокоўскі губэрнатар засасадзіў пад арэшт на 3 месяцы 88 чэлавек, устроіўшых у Лодзі жыдоўскі пагром.

**Неспакойства паміж студэнтамі.**

14 марца у Пецярбурзе с прычыны нездаволення атказам правіцельства на запрос Г. Думы аб ленскай справе, пачаўся трывожны рух паміж студэнтамі і студэнткамі ўсіх вышэйшых школ. У унівэрсытэці студэнты пакінулі лекціі, і пяючы „Вечная памяць“, направіліся к выхаду. У гэты час явілася паліція і студэнты разышліся. Тое сама адбылося у Політэхнічным інстытуце: студэнты пеялі «Вечную памяць», а паліція разганяла. На высших жаночых курсах Лахвіцкой-Скалоні у Псіхоневрологічным інстытуце адбыліся сходкі, на каторых выносілі пратэсты і абьявілі аднадневную забастоўку. У ночы ахранным аддзеленьнем зроблена шмат обыскаў і арэштаў. Пры унівэрсытэце і Політэхнічным інстытуце — паліція.

= У Казанскім унівэрсытэце так сама неспакойна Студэнты абьявілі трохдневную забастоўку як пратэст проці увольнення прафэсароў Фірсова і Земнова. Каля унівэрсытэту паліція. Вышэйшые жаночые курсы да часу закрыты.

**Забастоўкі і дэмонстраціі работнікоў.**

У Рызе на рэзінавай фабрыцы «Праваднік» увялі новую мазь (дзешавейшую) для галёш. Праз гэту мазь неколькі работніц атруцілася, а рэшта не маглі працаваць, бо ад запаху мазі работніцы млелі. Гэту самую мазь увяла ў сябе і другая рызіновая фабрыка у Пецярбурзі — «Трэугольнік». Тут ешчэ большые пачаліся атруцьця і абамлення. 14 марца атруцілося 500 работнікаў, с каторых 50 прышлося адвясьці у бальніцу. Як разышлася гэта вестка між работнікамі, то яны заразжэ, лікам 3000 чэлавек, пакінулі працу, сабраліся на заводзе і пастанавілі абьявіць забастоўку ва ўсіх майстэрнях. После гэтаго вышлі на вуліцу, к ім прылучылося ешчэ народу, і абразаваўся дзесяці-тысячны мітінг (сход). Прыстаў са стражнікамі хацеў забастоўшчыкаў разагнаць, але яны сталі кідаць каменьнямі і паліція уцекла. Тады прыехалі конные гарадавікі. Іх так сама пачалі біць каменнямі і стрэляць. Тады гарадавікі пачалі сеч народ шаблямі; работнікоў разагналі; каля ста чэлавек паранілі. У дзьве гадзіны работнікі ізноў сабраліся і ўзноў была бойка. Ранілі прыстава, ротмістра і акалодачнаго. 30 чэлавек арэштавана 15 марца забаставаў ужо увесь завод. Поруч з гэтай забастоўкай праводзіцца далей забастоўка пратэсту проці уціску на рабочые газэты. Бастуе Пуцілаўскі і іншые заводы. 14 марца баставала 20 тысяч работнікаў. У работнікаў робюць обыскі і арэшты. Граданачальніх паведамляе што 13 марца баставало 46,581 работнікаў фабрык, заводоў і друкарняў сталіцы. На Неўскім гурток работнікаў сьпеваў рэволюцыйныя песьні. У звязку з гэтым і ў Маскве на некаторых фабрыках забастоўкі. У Рызі на заводзі „Праваднік“ бастуе 3800 работнікоў.

**Свабода друку.**

За першые два месяцы гэтаго году аштрафована 92 часопісі на 32 150 р. Пасаджэна пад арэшт 13 рэдактароў. Канфіскована часопісі 113 раз. Апрача рэдактароў пацягнулі пад суд 20 аўтораў. Прыцынена да суду 6 часопісеў.

= У Пецярбурзі наложэна арэшт на № 62 «Дня». Рэдактара цягнуць пад суд.

= У Маскве наложэна арэшт но № 54 «Трудавой Капейкі». Рэдактара цягнуць пад суд.

= У Варшаві конфіскована № 6 часопісі «Pracownica Polska».

= М Горкаго цягнуць пад суд за яго раман «Мать». Горкаму грозіць ссылка.

**Обыскі і арэшты.**

= У Сімфаропалі сярод рабочых зроблена шмат обыскаў і арэштаў. Арэштована такжэ быўшаго члена Г. Думы. Кузнецова.

= З Іркуцка паведамляюць, што ў звязку с пробай уцячы Брэшко Брэшкоўскай, па ўсім ленскім тракце ідуць вялікіе арэшты і обыскі.

**Суд.**

= У Вільні ваенна-палевы суд засудзіў на 20 год катаргі салдата Раскіна за тое, што той памеціў стрэльбай на свайго «дзядзьку».

= У Селішчэнскіх казармах (Новгародз. губ.) па пастанаўленню суда разстрэлялі двух салдатаў канонiроў за убіўство фельдфебеля.

= У Пецярбурзе ваенна акружны суд засудзіў на 4 годы арэштанцкіх рот афіцэра Донэ за ўбіўство салдата.

**Справы і спраўкі адміністраціі.**

= У Рызе пры разборы дзела 17 рабочых завода «Саламандра», каторые масьціліся забіць фабрычнаго інспэктара, выясьнілося між іншым здекаваньне над арэштованнымі у паліціі. У сыскном аддзеленьні палілі ім ногі, білі рэзінавымі палкамі, раздзетых клалі на стале, садзіліся ім на плечы і білі, затыкаючы губы анучамі. Здекаваліся над імі начальнік сыскной паліціі Грэгус і сышчыкі. Цяпер гэты самы Грэгус пераводзіцца у Пецярбург на вышэйшую службу—на памочніка начальніка пецярб. паліціі.

= У Елісаветградзе у судзебнай палаце пры разборы справы быўшаго памочніка прыстава, а цяпер прыстава Кобылянск. уезда, Полтаўск. губ., Анісімова, вінавачэнаго у здекаваньні над арэштованымі, выкрыліся такіе яго спраўкі. Арэштаваўшы у с. Міронаўцэ западозрэнных у праступках селян ён загадаў стражнікам біць іх мокрымі вяроўкамі Арэштованных біў нагамі, палкай і мэталёвым наручнікам сам Анісімов. Мучылі цэлы дзень, пакуль усе да віны не прызналіся; столь і сцены сельскаго упраўлення былі заліты крывёй арэштованых. Палата прысудзіла Анісімова к арэшту пры паліціі на 2 месяцы.

= У Шадрынску (Пермск. губ.) па жаданьню нейкай Ефімовай зрабілі рэвізію на кватэры у мейсцоваго іспраўніка Кірыллова, і... знайшлі шмат уселякіх крадзеных рэчэй. Кірылова аддалі пад суд. Цікава, што гэты самы пан іспраўнік спаўняў абавязак цэнзара і так сумленна, што маленькая часопісь «Ісет» за чатыры месяцы заплаціла штрафаў 1800 рублёў.

Рэдактар **І. Луцэвіч.**
Выдавец **А. Уласоў.**

ПЕРВОРАЗРАДНЫЕ ШВЭДСКІЕ ЦЭНТРАФУГІ

АЛЬФА ЛЯВАЛЬ І ДІАБОЛО

СУЛІЦЬ ЗЫГМУНТ НАГРОДЗКІ

Вільня, Завальная 11.

Выйшлі з друку

**новые цэннікі насеньня кормных расьлін і штучных навозоу**

**(супэрфосфат, томасшляк, салетра і др.)**

Цэннікі гэтые і брашуры аб спосабах ужываньня штучных навозоў высылаю безплатна тым, хто прышле свой адрэс.

**ЗЫГМУНТ НАГРОДЗКІ**

**у Вільні, Завальная № 11.**

Штучные навозы

**найлепшаго гатунку с парукай за працэнт карысных солей.**

**Супэрфосфат** краёвы 13/14 16/18 18/20 і 20/22 %
» загранічны 13/14 і 20/22 %.

**Томасшляк** загранічны кляймо Альбэт або Звезда на распускны ці агульны змест фосфорнай кіслаты.

**Салітра** хілійская і норвэржская.

**Соль** паташная 30 і 20%.

**Каініт** і іншые штучные навозы.

Суліць **Зыгмунт Нагродзкі**

**у Вільні, Завальная вуліца № 11.**

Цэна і брашуры аб спосабах ужываньня штучных навозоў на жаданьне высылаюцца без аткладу.

**Сеялкі** да штучных гнаёў: Полёнія, Мэліхара і Вэтфалія Голіат Коксмана.

У маёнтку Вялікіе Граничы

**Вілейскаго пав. Віленскай губ.**

Дзедзіча Свіды, прадаюцца 400 дзесяцін зямлі, парэзаные на хутарскіе вучасткі рознай меры, у кожным ёсць сенажаць і лясочак. 7 вёрст ад ст. Уша Л. Р. ж. д. Аб варунках можна даведацца па адрэсу: *Горад Радашковічы, Віленскай губ., м. Вялікіе Граничы, Стэфану Свіда.*

Толькі БЕЛАРУСАМ селянам

прадаюцца вучасткі зямлі у іменьн Гай, каля самаго гораду Пінска Задатак па 20 руб ад дзесяціны разсрочка платы на колькі гадоў па 6%. Асабліва важна для гароднікоў, рэмесьнікоў, фабрычных работнікоў і скатаводоў.

**Э. Зулеміль, ім. Гай, каля гор. Пінска Мінск. губ.).**

У дварэ Дзержаны

**почта Эйрагола, Ковенскай губ.**

маюцца на прадаж прывозные з Бэльгіі жэрабцы Ардэны і Брабансоны, а такжэ з Англіі Сгіры.

Прадажа на раты.

ДАСТУПНА КОЖНАМУ купіць вучастак зямлі у „Звярынцы“ у самай лепшай часьці гораду Вільні. Мейсцовасць прыгожая, здровая лео і рэка.

Цэны і варункі выгодные.

С купляй пасьпешайця: зямлі асталося саўсім мала! Гэта—апошні раз напамінаецца.

За спраўкамі звертацца у кантору па прадажы вучасткоў у Зьвярынцы: Вільня „Звярынец“, Георгіеўскіпраспэкт, д. № 48. Тэл. № 46.

**Спраўкі выдаюцца праз увесь дзень, не вылучаючы і сьвят.**

Друкарня Мырціна Кухты, Татарская 20.